ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 8 (59)

■ Асоба

ВАЕНАЯ НАВУКА — ГОНАР І СУМЛЕННЕ

Ёй вучыць сваіх курсантаў ганаровы педагог Ваеннай акадэміі з 45-гадовым стажам

Больш як 9 з паловай тысяч курсантаў і афіцэраў з 25 краін свету ён навучыў ваеннаму майстэрству за гады выкладчыцкай дзейнасці ў Ваеннай акадэміі Беларусі. Яго выпускнікі — сённяшнія генерал-лейтэнанты і дэпутаты, кіраўнікі воінскіх падраздзяленняў і начальнікі кафедраў ваеннай альма-матэр. Для ўсіх вучняў 80-гадовага педагога аднымі з найважнейшых пастулатаў і сёння з'яўляюцца гонар, маральная годнасць і сумленне афіцэра. Менавіта гэтай найважнейшай навуцы — выхаванню асобы — прысвяціў сваё жыццё ганаровы педагог Ваеннай акадэміі з 45-гадовым стажам, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры сацыяльных навук, палкоўнік у адстаўцы Уладзімір СВЯКЛА.

Уладзімір СВЯКЛА — выкладчык Мінскага вышэйшага інжынернага зенітна-ракетнага вучылішча (цяпер Ваенная акадэмія). 1970 год.

— Люблю сваю працу ўсім сэрцам, — кажа ў пачатку нашай размовы 80-гадовы педагог. — Пакуль жыву, буду вучыць і выхоўваць у курсантах асобу. Бо лічу, без высокіх маральных пачаткаў — прыстойнасці, сумленнасці, сілы духу і патрыятызму — не можа адбыцца ні салдат, ні лейтэнант, ні генерал.

Уладзімір Свякла — з кагорты тых афіцэраў-педагогаў, хто і сёння застаецца на перадавой лініі барацьбы за духоўнасць, культуру, патрыятызм у армейскіх радах, а значыць, за выхаванне асобы з вялікай літары. І выхоўвае ён асабістым прыкладам, распавядаючы пра гады афіцэрскай службы ў вялікіх і малых, у самых аддаленых гарнізонах, пачынаючы з Далёкага Усходу і заканчваючы роднай Беларуссю.

Першай марай шэравокага хлапчука з невялікай беларускай вёсачкі Барова, што за паўтара кіламетра ад Нёмана, была мара стаць ваенным лётчыкам. Яго бацька пайшоў на фронт і не вярнуўся. Радавы пяхоты, ён загінуў у баі і быў пахаваны ў Інстэрбургу. У гады вайны Барова называлі Масквой — гэта мястэчка знаходзілася на тэрыторыі партызанскага краю, і бараўчане, чым маглі, дапамагалі партызанам. Уладзімір Іванавіч успамінае, як іх сям'я на свой страх і рызыку хавала ў хаце на печы чырвонаармейца Сашу Карэліна з Архангельскага краю. Пазней той пайшоў у партызанскі атрад і загінуў у дазоры. Ужо пасля Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір Свякла пачаў пошукі загінуўшага салдата праз Падольскі ваенны архіў і газету «Красная звезда», але, на жаль, беспаспяхова.

Уладзімір СВЯКЛА (злева) падчас парада ў Маскве, прысвечанага 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Буквар будучы педагог першы раз у рукі ўзяў толькі ў сорак чацвёртым, ужо пасля вызвалення беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Скончыўшы сямігодку, вучыўся ў Іўеўскай сярэдняй школе, дзе быў адным з найлепшых вучняў. Трое хлопчыкаў, бацькі якіх загінулі на франтах Вялікай Айчыннай, атрымаўшы атэстат, прынялі рашэнне пайсці ў ваеннае вучылішча. Уладзімір Свякла і яго сябар з суседняй вёскі Генка Пінчук, бацьку якога за сувязь з партызанамі расстралялі фашысты, разам прыйшлі ў ваенкамат.

Курсантам Арзамаскага ваеннага вучылішча сувязі Уладзімір Свякла стаў у 1954 годзе. І, паколькі быў выдатнікам, меў права сам выбіраць першае месца сваёй службы — Групу савецкіх войскаў у Германіі. Першая воінская пасада — камандзір радыёўзвода 74-га гвардзейскага Валдзінскага танкавага палка. Па выніках першага года службы лейтэнанта яго ўзвод заняў першае месца ў дывізіі. Ужо тады ў маладога афіцэра праявіліся задаткі і добрага арганізатара, і настаўніка. І справа тут не столькі ў прафесійнай падрыхтоўцы афіцэра, колькі ў яго адносінах да службы, да людзей і падначаленых.

Немалы вопыт умелага арганізатара і кіраўніка афіцэр набыў на Далёкім Усходзе, дзе служыў на пасадзе прапагандыста 504-га зенітна-ракетнага палка. Афіцэр марыў аб выкладчыцкай дзейнасці. Нават накіраваў ліст начальніку аддзела кадраў палітупраўлення і атрымаў адказ: «Пры станоўчай атэстацыі з вайсковай часці і неабходнасці ў кадрах будзеце накіраваны педагогам».

У 1971 годзе Уладзімір Свякла прыбыў на новае месца службы. І з таго часу выкладае ў сценах Ваеннай акадэміі Беларусі адну з самых складаных навук — філасофію, застаючыся для курсантаў не толькі патрабавальным настаўнікам, але і добрым дарадцам, верным таварышам.

З першага вучэбнага занятку выкладчык вядзе дзённікі. Сёння іх — 45. У гэтых тоўстых агульных сшытках ён запісвае экзаменацыйныя адзнакі курсантаў, тэмы гутарак з імі — адным словам, складае сацыяльны партрэт навучэнца для таго, каб знайсці да кожнага індывідуальны падыход, каб лепш зразумець курсанта і выявіць яго творчыя здольнасці.

Уладзімір Свякла — з кагорты тых афіцэраў-педагогаў, хто і сёння застаецца на перадавой лініі барацьбы за духоўнасць, культуру, патрыятызм у армейскіх радах, а значыць, за выхаванне асобы з вялікай літары.

Ён любіць працу, якой аддаў 45 гадоў свайго жыцця, і вучыць любіць прафесію ваеннага будучых афіцэраў. Уладзімір Іванавіч распавядае пра тое, як вучыліся курсанты сямідзясятых гадоў, як умелі сябраваць і шанаваць гэтае сяброўства. Распавядае пра гады навучання ў Ваенна-палітычнай акадэміі імя Леніна ў Маскве і пра тое, як прыбыў у Ваенную акадэмію (тады Мінскае вышэйшае інжынернае зенітна-ракетнае вучылішча). Ва Уладзіміра Іванавіча шмат нявыдуманых гісторый. Пра тое, як ён, курсант Арзамаскага ваеннага вучылішча сувязі, купіў першы ў жыцці наручны гадзіннік; пра цяжкі пасляваенны час, калі маці, Валянціне Уладзіміраўне, і двум яго малодшым сястрычкам прыходзілася выжываць... І як ён сустрэў сваю другую палову — жонку Святлану Дзмітрыеўну. Яна па прафесіі таксама педагог (з дынастыі выдатных настаўнікаў), а па жыцці — сапраўдная баявая сяброўка.

У Ваеннай акадэміі дацэнта Свяклу называюць архіварыусам кафедры сацыяльных навук. Ён можа не толькі расказаць пра гісторыю кафедры і вопыт падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў, а і пра насычаную выкладчыцкую дзейнасць педагогаў. З'яўляецца членам Ваенна-гістарычнага савета акадэміі, удзельнічае ў міжнародных навукова-практычных канферэнцыях, аўтар мноства метадычных рэкамендацый, брашур, навуковых артыкулаў, кніг, публікацый.

Летась палкоўнік у адстаўцы стаў ганаровым педагогам Ваеннай акадэміі. Я пацікавілася: якія сакрэты выхавання ў аднаго з найстарэйшых афіцэраў-педагогаў? Уладзімір Іванавіч, як заўсёды, шчыра адказаў: «Перш за ўсё выкладчык павінен сам быць асобай і сваім асабістым прыкладам выхоўваць курсантаў. І яшчэ афіцэр-педагог імкнецца прытрымлівацца і вучыць курсантаў наступным пастулатам: не рабіць іншым таго, чаго не жадаеш сабе, быць добрым і спагадлівым у адносінах да навакольных, ставіцца да кожнага чалавека паважліва, быць самому і вучыць іншых быць годнымі людзьмі, жыць па сумленні».

Трэба сказаць, што і ранейшыя, і цяперашнія курсанты ўдзячныя Уладзіміру Іванавічу за гэтую навуку жыць па сумленні.

Ірына БУРАК.
Фота з архіва Уладзіміра СВЯКЛЫ

■ Абеліскі параненай зямлі

АТЭСТАТ АБ ВЫЖЫВАННІ

Яго атрымалі не ўсе: кожны другі падлетак-рамеснік з Беларусі загінуў падчас блакады Ленінграда

На Піскароўскіх мемарыяльных могілках, што ў Санкт-Пецярбургу, у 1996 годзе была ўстаноўлена стэла памяці беларускім рамеснікам, якія загінулі ў блакадным Ленінградзе. Каля 12 тысяч падлеткаў з Беларусі, працуючы дзеля фронту, памерлі ад голаду і трапілі пад варожыя кулі...

З кастрычніка 1940-га да чэрвеня 1941 года з Мінска ў Ленінград прыехала вучыцца каля 24 тысяч падлеткаў. Юнакі і дзяўчаты з Беларусі атрымлівалі адукацыю ў рамесных вучылішчах і школах фабрычна-заводскага навучання. Ім было ўсяго па 14—16 гадоў.

МАЙСТРЫ ЗАМЯНІЛІ БАЦЬКОЎ

Перад вайной у Савецкім Саюзе планавалася пабудаваць шмат буйных прамысловых прадпрыемстваў. У Беларусі, напрыклад, трактарны, аўтамабільны і многія іншыя заводы. Але ўсюды не хапала кваліфікаваных рабочых кадраў: токараў, слесараў, фрэзероўшчыкаў і іншых. Таму, згодна з указам «Аб дзяржаўных працоўных рэзервах», выдадзеным 2 кастрычніка 1940 года Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР, у буйных гарадах былі створаны рамесныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага навучання. На заклік асвойваць рабочую справу адгукнулася вялізная колькасць падлеткаў.

Па аповедах Арсенія Люцко, калі зусім не было чаго есці, сілкаваліся рамянямі. «Рэзалі іх на кавалачкі, варылі, прычым строга вялі ўлік, колькі кавалачкаў пакласці ў кацялок».

Каб атрымаць прафтэхадукацыю, з беларускіх сёлаў у Мінск прыбыло каля 50 тысяч падлеткаў. Але мінскія вучылішчы былі не ў стане прыняць усіх, і па распараджэнні з Масквы каля 24 тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак накіравалі ў Ленінград, дзе іх цёпла прынялі на буйнейшыя заводы горада.

Падлеткаў размясцілі ў інтэрнатах, выдалі форменную вопратку, якая ім вельмі падабалася. «Вельмі прыгожая форма ў нас была: строгая, чорная, падобная на марскую, — успамінае ветэран Вялікай Айчыннай вайны Арсеній Люцко. — Мы гэтай формай ганарыліся. Кожнаму з нас выдалі шырокі рэмень са спражкай. Ідзеш, бывала... Ух!»

— Калі на завод (Кіраўскі. — **Аўт.**) прыйшлі, уражанне было такое, што мы патрапілі на іншую планету, — расказвае Сцяпан Скамарох. — Вялізныя цэхі, усюды станкі, шум... Нам да ўсяго хацелася дакрануцца. Але нам сказалі: «Пачакайце, аглядайцеся, прызвычайвайцеся, на гэтых станках вы будзеце працаваць!»

І сапраўды, усю зіму 1940—1941 гадоў яны самааддана працавалі, а разам з тым вучыліся ў сваіх настаўнікаў-майстроў. Падлеткі іх вельмі паважалі і любілі, адчувалі, што майстры замяняюць ім бацькоў.

СІЛКАВАЛІСЯ СКУРАНЫМІ РАМЯНЯМІ...

Малалетнія рамеснікі жылі ў пакоях па 20 чалавек. «Кожную раніцу прачынаешся і глядзіш: Міша жывы, Пеця жывы — добра... Таго, хто памёр, разам з ложкам перацягвалі ў іншы халодны пакой», — успамінае адзін з рамеснікаў Уладзімір Паўлюкевіч. Днём па вуліцах Ленінграда хадзілі машыны і збіралі памерлых, вывозілі іх на Піскароўскія і іншыя могілкі.

— Быў якраз самы цяжкі перыяд для жыхароў блакаднага Ленінграда, асабліва для дзяцей, — расказвае работнік інтэрната Петухоў. — Пра зіму 1941—1942 гадоў цяжка нават успамінаць. Голад дасягнуў свайго апагея. Тыя, хто быў мацнейшы фізічна, хадзілі на разбураныя Бадаеўскія склады па цукар або, калі больш правільна сказаць, па тое, што засталося ад яго пасля пажару. У той жа час можна было назіраць такую карціну: паміж абломкамі канструкцый хадзілі, поўзалі на каленях самотныя постаці. У кожнага цераз плячо вісела торба ад процівагаза. Гэта рамеснікі. Невялікім ломам яны адколвалі кавалкі зямлі, змочаныя цукрам, набівалі ёю сумкі і цягнулі ў інтэрнат. Затым кідалі кавалак зямлі ў кацялок, заліваллі вадой, падагравалі. Калі жыжка асядала на дно, асцярожна зліваллі салодка-горкую субстанцыю ў рондаль і па паўміскі дзялілі паміж хворымі таварышамі.

Па аповедах Арсенія Люцко, калі зусім не было чаго есці, сілкаваліся рамянямі. «Рэзалі іх на кавалачкі, варылі, прычым строга вялі ўлік, колькі кавалачкаў пакласці ў кацялок, — успамінае ветэран Вялікай Айчыннай вайны. — Вывозілі нас з блакаднага Ленінграда ў цяжкім стане. «Дарога жыцця» кантралявалася немцамі, часта падвяргалася абстрэлам, бамбёжцы з паветра. Вывозілі нас пад прыкрыццём ночы. Клалі на дно кузава «палутаркі» (сядзець мы не маглі), накрывалі шынялямі і такім чынам эвакуявалі з абложанага горада. Я памятаю, як праехаўшы 15 кіламетраў па лёдзе Ладажскага возера, мы трапілі пад налёт варожай авіяцыі. На нашых вачах дзве машыны з дзецьмі-рамеснікамі, якія былі наперадзе, пайшлі пад лёд. Шафёр выбраўся з кабіны і просіць: «Хлопцы, дапамажыце! Патонем!» А мы ляжым і галовы падняць не можам...»

Нават у голадзе блакады яны набліжалі Перамогу.

ЛЁС БЛАКАДНІКАЎ

Пасля трохмесячнага шпітальнага лячэння яны вярнуліся да жыцця. Усе трое. Валодзю Паўлюкевіча закінула на Урал, Арсенія Люцко — у Сібір, Сцёпа Скамарох адправіўся ў Грузію.

У кожнага з іх лёс склаўся па-свойму. Сцяпан Антонавіч Скамарох скончыў індустрыяльна-педагагічны тэхнікум і больш як 40 гадоў адпрацаваў старшым майстрам гарадскога прафесійнага тэхнічнага вучылішча №117 металістаў у Мінску. Спраўдзілася яго мара быць настаўнікам. Уладзімір Лаўрэнцевіч Паўлюкевіч быў намеснікам кіраўніка спраў ЦК КПБ. Арсеній Васілевіч Люцко вайну скончыў у Вене. Пасля вайны паспяхова працаваў і дайшоў да намесніка міністра сацыяльнага забеспячэння БССР. Апошнім часам працаваў у штаб-кватэры ААН у Вене, дзе прадстаўляў Беларусь. Атрымаў звыш 30 урадавых узнагарод.

У 1984 годзе яны сталі героямі кінастужкі «Дарога жыцця» беларускага кінадакументаліста, заслужанага дзеяча мастацтваў Анатоля Алая.

Каб ушанаваць памяць тых, хто не дажыў да Перамогі, у дні памяці (8 мая, 8 верасня і 27 студзеня) на Піскароўскія могілкі прыходзяць прадстаўнікі беларускага пасольства ў Санкт-Пецярбургу, кіраўнікі і члены беларускіх таварыстваў, беларусы горада. Ленінградцы-пецярбуржцы бясконца ўдзячныя падлеткам з Беларусі, якія загінулі, абараняючы наш горад.

Раіса БАРАДЗІНА, *г. Санкт-Пецярбург*